Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Загад рэктара БДПУ
№1094 лс ад 10.10.12

Факультэт эстэтычнай адукацыі

Кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

# Беларуская драматургія на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы і яе ўплыў на фарміраванне асобы школьніка

Дыпломная работа
па «Сусветнай і айчыннай культуры, фальклору і методыках іх выкладання»

студэнткі 4 курса 45 а групы
Хан Ганны Аляксандраўны

Навуковы кіраўнік:
Васілевіч У.А.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Мінск 2013

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Уводзіны

Беларуская драматургія цікавіць шматлікіх даследчыкаў, крытыкаў, а таксама простых аматараў літаратуры і тэатральнага мастацтва. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, які з пачатку свайго заснавання жыве творамі ў першую чаргу беларускай драматургіі.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы адкрыўся 14 верасня 1920 года ў будынку Мінскага губернскага тэатра, пабудаваным па праекце архітэктараў Караля Казлоўскага і Канстанціна Увядзенскага ў 1890 годзе з дапамогай ахвяраванняў грамадзян.

У 1917 годзе ў будынку Мінскага гарадскога тэатра праходзіў Другі з'езд армій Заходняга фронту, у лютым 1919 года - Першы Усебеларускі з'езд Саветаў. У 1944 годзе быў перайменаваны ў гонар класіка беларускай літаратуры, паэта Янкі Купалы. Нядаўна будынак тэатра перажыў рэканструкцыю, у выніку чаго яму быў вернуты першапачатковы выгляд.

**Мэтай** дадзенай работы з'яўляецца даследаванне выхаваўча-педагагічнага патэнцыялу тэатральных спектакляў паводле п'ес беларускіх драматургаў на сцэне Купалаўскага тэатра, распрацоўка методыкі, якая дазволіць зацікавіць вучняў у вывучэнні тэатральнага мастацтва.

**Задачы**:

- даследаваць вытокі беларускага тэатра;
- прааналізаваць некаторыя творы 19-20 стагоддзяў, пастаўленыя на сцэне Купалаўскага тэатра;
- прасачыць адлюстраванне сялянскага жыцця 19 стагоддзя ў тэатральных пастаноўках Купалаўскага тэатра;
- ахарактарызаваць пастаноўкі Купалаўскага тэатра па творах беларускіх пісьменнікаў 19-20 стагоддзяў.
- развіццё камунікатыўных і творчых здольнасцяў навучэнцаў праз выхад у пазашкольную прастору;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- павышэнне агульнаэстэтычнага ўзроўню культуры вучняў;

- вывучэнне выхаваўчых і педагагічных магчымасцяў тэатральных пастановак спектакляў паводле п'ес беларускіх драматургаў на сцэне Купалаўскага тэатра;

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца беларуская драматургія XVIII – XX стагоддзяў, ўплыў тэатральнага мастацтва на фарміраванне асобы школьніка. **Прадметам** – увасабленне твораў беларускай драматургіі на сцэне Купалаўскага тэатра.

Дыпломная работа складаецца з уводзін, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадатка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ